ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар дзяржаўнай
установы культуры
"Астравецкая раённая
бібліятэка"
__________ Н.У. Ачарэтава
"__10__"__________2024 г.

**Праект па патрыятычнаму выхаванню моладзі**
**"Памяць адна на ўсіх"**
**Астравецкай раённай бібліятэкі**
**на 2024 год**

## Абгрунтаванне праекта

"Патрыятызм - гэта не значыць толькі адна любоў да сваёй Радзімы. Гэта значна больш..." (А.Н. Талстой).

Чалавека нельга навучыць патрыятызму, яго трэба выхоўваць у атмасферы патрыятызму: праз апавяданні, вершы і песні, якія апавядаюць аб веліч і самаадданасці савецкіх салдат, праз наведванне памятных месцаў баявой славы, якія маюць асаблівую энергетыку тых падзей і часоў.

У 2024 г. спаўняецца 80 гадоў з дня вызвалення Беларусі ад нямецка - фашысцкіх захопнікаў. Гэта адна з самых найважнейшых дат у нашай гісторыі. Сярод гістарычных дат 2024 года гэтая дата займае асаблівае месца, па маштабах выпрабаванняў і страт, па ўплыве на сусветную гісторыю і па актуальнасці - нават цяпер, праз восем дзесяцігоддзяў.

Вялікая Айчынная вайна стала найскладанейшым выпрабаваннем для народа нашай краіны і не толькі. Яна пакінула глыбокі адбітак у памяці людзей. Усё менш застаецца ўдзельнікаў і сведкаў Вялікай Айчыннай вайны, носьбітаў дакладнай інфармацыі аб ваенным ліхалецці.

На жаль, і зараз з'яўляюцца людзі, якія жадаюць перапісаць гісторыю і абязлічыць ролю нашай краіны ў барацьбе з фашызмам. У сувязі з гэтым патрыятызм становіцца важным элементам па аб’яднанню розных пакаленняў. Вяртаецца ўсведамленне таго, што для выхавання дастойнага грамадзяніна і патрыёта неабходна фарміраваць у моладзі і іншых катэгорый насельніцтва пачуццё адданасці роднай зямлі, гонару за гісторыю сваёй краіны.

Стварэнне гэтага праекта накіравана на работу па выхаванню ў грамадзян гонару за свой народ, павагі да яго здзяйсненняў і прадугледжвае прыцягненне моладзі да вывучэння знамянальных дат Вялікай Айчыннай вайны 1941-1945 гадоў і ўдзелу ў мерапрыемствах патрыятычнай накіраванасці. У сучасных умовах наша задача - захаваць памяць аб падзеях тых далёкіх гадоў і ўспаміны рэальных удзельнікаў падзей, а таксама стварыць у падрастаючага пакалення "імунітэт" супраць недакладнай інфармацыі. У нашых сілах зрабіць так, каб подзвігі нашых прадзедаў памяталі і шанавалі будучыя пакаленні.

**Мэта праекта:**

Фарміраванне патрыятычных пачуццяў у моладзі праз далучэнне да чытання, выхаванне любові да кнігі. Выхаваць пачуццё гонару за сваю малую Радзіму і беражлівых адносін да гісторыі роднай краіны.

**Задачы праекту:**

Фарміраванне патрыятызму праз ваенна-гістарычную прозу і паэзію аб Вялікай Айчыннай вайне. Распаўсюджваць краязнаўчыя веды і выхоўваць у грамадзян цікавасць да гісторыі сваёй малой радзімы. Паглыбіць веды аб подзвігах землякоў падчас Вялікай Айчыннай вайны.

**Чаканыя вынікі:**

- павышэнне патрыятызму ў грамадзян;
- павышэнне цікавасці да гераічнага мінулага Айчыны і развіццё пачуцця гонару за вялікія падзеі і гістарычнае мінулае сваёй краіны;
- фарміраванне ў моладзі пачуцця любові да Радзімы і павагі да абаронцаў Айчыны;
- павышэнне цікавасці да гістарычнай літаратуры;
- павышэнне цікавасці да мастацкіх твораў пісьменнікаў і паэтаў патрыятычнага зместу;
- стварэнне станоўчага вобразу герояў-абаронцаў Вялікай Айчыннай вайны на аснове ваенна-патрыятычнай літаратуры;
- прывіццё павагі і любові да сваёй малой Радзімы;
- павышэнне ўзроўню ведаў аб гістарычных падзеях, месцах свайго раёна і земляках, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

**Выканаўцы: Астравецкая раённая бібліятэка.**

**Тэрмін рэалізацыі праекта – 2024 год.**

**План мерапрыемстваў па рэалізацыі праекта**

| № п/п | Мерапрыемствы | Тэрмін выканання |
|---|---|---|
| 1. | Віртуальны праект “Их воспитала война» | На працягу года |
| 2. | Дзень памяці і смутку “Праз гады, праз вякі – помніце! / да Міжнароднага дня памяці ахвяр Халакосту. | Студзень |
| 3. | Бібліякараван “Партызанская паляна” (да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка фашысцкіх захопнікаў). | Красавік – ліпень ( 11 маршрутаў бібліобуса) |
| 4. | Акцыя ў гарадскім парку “След вайны ў маёй сям’і” (да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка фашысцкіх захопнікаў). | Красавік – ліпень |

| | | |
|---|---|---|
| 5. | Экскурс у гісторыю “Пепел Хатыни в сердца нам стучится” / да Дня памяці ахвяр Хатыні. | Красавік |
| 6. | Гістарычны хранограф “Ішоў салдат да Перамогі” / да Дня Перамогі. | Май |
| 7. | Гадзіна подзвігу і славы “Той самы першы дзень вайны”/ да Дня памяці і смутку. | Чэрвень |
| 8. | Вечар – рэквіем “Вайна ў лёсе роднага края”/ да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. | Ліпень |
| 9. | Урок памяці “Генацыд на Астравеччыне”. | Жнівень |
| 10. | Урок памяці “Читать, знать, помнить”.. | Лістапад |
| 11. | Дзень памяці “Дорогами той страшной войны»/да Міжнароднага дня памяці ахвяр злачынстваў генацыду. | Снежань |
| 12. | Удзел у Абласным літаратурным марафоне “В 44-м пришла в Принемонье Победа». | Красавік – ліпень |
| 13. | Удзел у Абласным інтэлектуальным конкурсе літаратура-пазнавальных праектаў інтэрнет – рэсурсаў "Это нашей истории строки". | Красавік – ліпень |
| 14. | Кніжная выстава-панарама “Геноцид. Вспомнить все, помнить каждого” да 80 годдзя з дня вызвалення Беларусі ад нямецка - фашысцкіх захопнікаў. | На працягу года |

Заг. аддзелам абслугоўвання і інфармацыі К.Ф.Аскерка